ЧАС ПРАЎДЗІВЫХ НАВІН
№23 (546)
6 ЧЭРВЕНЯ 2013, ЧАЦВЕР
ганцавіцкі час
ВЫДАВЕЦ: ПВГУП «МЕДЫЯ-ГАНЦАВІЧЫ» | ПЕРЫЯДЫЧНАСЦЬ: 1 РАЗ У ТЫДЗЕНЬ
WWW.GANC-CHAS.BY

В НОМЕРЕ

Сакрушальная бура на могілках у Будчы пакінула містычны след



Многія жыхары, чые родзічы пахаваны на будчанскіх могілках, панеслі мільённыя страты пасля буры, якая пашкодзіла дзясяткі помнікаў і агародж.
3 СТАРОНКА

На Ганцевщине появились цыгане

ОСТОРОЖНО, МОШЕННИКИ!

Около 6 миллионов рублей пропало у пенсионерки из д. Остров после того, как к ней наведались цыгане в нынешний понедельник, 3 июня. Сигналы о появлении непрошеных гостей поступили также из деревень Мальковичи и Хотыничи.

Очевидцы рассказали, что в д. Остров цыгане – мужчина и женщина – ездили по деревне на автомобиле «Жигули» и предлагали товар. После их отъезда жительница этой деревни обнаружила, что у нее из сумочки пропали деньги. Она заявила об этом в милицию утром 4 июня. Сейчас милиционеры разыскивают мошенников: правоохранителям известен номер машины, на которой передвигались цыгане.

В д. Хотыничи цыган видел водитель проезжающего мимо автомобиля. А в деревню Мальковичи цыгане (две женщины и ребенок) приехали утренним дизельным поездом 4 июня. Они просили у сельчан еду. Бдительные жители деревни позвонили в милицию, и непрошеных гостей задержали, доставили в РОВД и поставили на учет.

Как пояснил начальник Ганцевичского РОВД Алексей Ярёменко, сотрудникам милиции было бы легче, если бы население оперативно информировало правоохранителей о появлении мошенников (в том числе и цыган) на территории района. Звонить можно по телефону «102» в дежурно-оперативную часть (с мобильного телефона звонок бесплатный) или участковому инспектору.

В Задубье выявили самогонщицу

ПРАВОНАРУШЕНИЕ

Невезучим стал нынешний понедельник 3 июня для пенсионерки из д. Задубье, у которой сотрудники милиции обнаружили в дворовой постройке 20 литров браги, 9 литров самогона и самогонный аппарат. За изготовление алкогольного напитка женщине грозит предупреждение или штраф от 500 тысяч до 3 миллионов рублей.

Анонимный сигнал о том, что сельчанка изготавливает «самопальный» алкоголь, поступил в милицию утром того же дня. Милиционеры оперативно выехали в д. Задубье. Обнаруженные в хозпостройке брагу и самогон правоохранители вылили, а самогонный аппарат изъяли.

Пенсионерка пояснила милиционерам, что изготовлением домашнего алкоголя занималась для собственных нужд, без цели продажи. На нее был составлен административный протокол по ст. 12.43 (ч.1 и ч.2) КоАП РБ.

СПРАВКА «ГЧ»

С начала нынешнего года на территории района было зарегистрировано 13 фактов изготовления крепких алкогольных напитков: в деревнях Хотыничи, Раздяловичи – по 4 факта, в д. Любашево и д. Б. Круговичи – по 2 факта, и 1 факту – в деревнях Куково, Мальковичи и Огаревичи.

Против Джигана возбуждено уголовное дело

КРИМИНАЛ

В пятницу, 31 мая, отделом Следственного комитета возбуждено уголовное дело по ч. 2 ст. 205 УК РБ (кража с проникновением в жилище) в отношении безработного жителя г.п. Микашевичи Лунинецкого района.

Мужчина попытался похитить одежду из дома в д. Ганцевичи ночью 20 мая и был оперативно задержан сотрудниками отделения «Охрана» на месте преступления.

Мужчину задержали в доме по ул. Пинской в д. Ганцевичи в момент, когда он оделся в хозяйские вещи: куртку и брюки. И хотя злоумышленник не успел ничего вынести из дома, ущерб оценен в 300 тысяч рублей.

Напомним, что злоумышленник по фамилии Джиган проник в помещение, разбив оконное стекло, примерно в 1.40 ночи. Дом, хоть и используется хозяевами как дача, но находится под охраной. Когда сработала сигнализация, сотрудники милиции выехали на место преступления и застали там ночного гостя, прятавшегося в комнате. Что он искал в чужом доме ночью, ему теперь придется ответить в суде.

■ КОЛОНКУ ПОДГОТОВИЛА СВЕТЛАНА МАЛЫШКО

В Ганцевичах шаровая молния сожгла гараж и повредила автомобиль

СЛУЖБА «101»

Во время грозы вечером в пятницу, 31 мая, от разряда шаровой молнии сгорел гараж и поврежден автомобиль ганцевчанина Михаила Скорины по ул. Некрасова, 6. Пострадали еще несколько жителей ул. Некрасова, у которых вышли из строя электроприборы.



Семилетний Денис первым увидел, как шаровая молния попала в гараж его деда Михаила Скорины. ФОТО ПЕТРА ГУЗАЕВСКОГО.

Пожар в городе начался примерно в 20.08 часов вечера. Как рассказал потерпевший Михаил Скорина, накануне вечером он выгнал свой «Фольксваген-Пассат» из гаража на улицу после ремонта. В тот день у ганцевчанина гостили внуки. Один из них, 7-летний Денис, во время грозы смотрел в окно и первым увидел, как шаровая молния попала в гараж. *«Я увидел, как светящийся огненный шар упал на капот «Пассата», потом покатился в гараж, а потом как бухнуло – и загорелось!»* – рассказывал мальчик. – *Я закричал: «Деда, деда! Гараж горит!»* *Дед выскочил на улицу и начал тушить огонь».*

Михаил Скорина сам начал тушить опжар, подключив шланг к водопроводу. Вскоре ему помогли оперативно приехавшие на вызов спасатели. Как рассказал потерпевший, если бы пламя не погасили в максимально сжатые сроки, то последствия пожара были бы куда более масштабными: прямо к его гаражу примыкают хозпостройки соседей, и огонь мог бы перекинуться на них в любой момент.

После пожара хозяину придется не только строить новый гараж, но и ремонтировать повреждённый огнем автомобиль. Михаил Скорина к этому относится с оптимизмом. *«Ничего, главное, все живы, а все остальное – дело наживное»,* – сказал он.



После пожара, который возник от разряда молнии, гараж по ул. Некрасова сгорел дотла. ФОТО ПЕТРА ГУЗАЕВСКОГО.

Надо отметить, что улица Некрасова в городе давно сыскала недобрую славу тем, что почти каждый год грозы и молнии наносят вред ее жителям. Вот и на этот раз от разгула стихии, помимо погорельца, пострадали еще несколько жителей улицы: у многих вышли из строя телефоны, бытовая техника и электроприборы.

Как рассказала одна из жительниц улицы Некрасова Людмила Карпиевич, во время разряда молнии у них в доме что-то треснуло, а потом из розеток посыпались искры. В одной из розеток от удара даже выскочила штепсельная вилка. Женщина испугалась. По ее словам, грозы она боится с детства. Еще когда жила в родительском доме на ул. Я. Купалы, как-то во время грозы в дом влетела шаровая молния, и с тех пор она очень боится гроз с молниями. *«Помню, как огненный красный шар с хвостом медленно проплыл по комнате. Мы боялись шелохнуться, пока он не исчез. С тех пор я не переношу гроз»,* – призналась Людмила Адамовна.

Почему молнии неизменно выбирают этот участок города – неизвестно. Некоторые люди говорят, что это гиблое место, построенное то ли на болоте, то ли на бывшем скотомогильнике. А некоторые ищут причину в другом, утверждая, что если бы на улице поставили молниеотвод, то жертв и разрушений было бы меньше.

■ СВЕТЛАНА МАЛЫШКО

СПРАВКА «ГЧ»

Защищаемся от шаровой молнии:

- **если в помещении шаровая молния, не хватайтесь за железные предметы;**
- **не пробуйте убежать от нее;**
- **не пытайтесь выгнать ее веником, книгой и т.д.;**
- **стойте, не двигаясь, сохраняйте спокойствие (ничего страшного не должно при этом произойти);**
- **если рядом дверь, а шаровая молния на приличном расстоянии от вас, укройтесь за дверью.**

У пенсіянеркі з в.Задуб'е згарэлі дровы і сарай

СЛУЖБА «101»

"Ахвярай" стыхіі, якая разгулялася ў суботу, 1 чэрвеня, у 20.30 гадзін вечара стала драўляная адрына з дровамі ў пер. Меліярацыйным у в. Задуб'е. Згарэлая маёмасць належыць 80-гадовай мясцовай жыхарцы, пенсіянерцы Вользе Сідарэвіч.

Як распавядала ўладальніца маёмасці, у момант навальніцы яна была ў хаце, адпачывала на канапе. Разрад маланкі яе вельмі напалохаў. *"Так моцна грымнула, што я ажно з падушкі ўскочыла, а на вуліцы як быццам зара займаецца. У акно гляджу, дравянікі мае гараць,* – расказвала пенсіянерка. – *Я выбегла на вуліцу, крычу: "Людзі, ратуйце, ратуйце!.." Ды ж хіба полымя патушыш - палае як свечка... Там метраў трыццаць дроў сухіх было, паколатых ужо. Ох, так шкада, што ўсё знішчана... Нічога не выратавалі. І нават бярозка, што паблізу расла, згарэла».*

Пенсіянерка сказала, што дровы былі нарыхтаваны на зіму, хоць яна зараз у халодную пару года перабіраецца ў горад да дзяцей. *"От, не буду я больш дроў купляць. Як е, так і е, а як згарэлі, дык што ж ужо рабіць. Напалохалася толькі моцна",* – выказалася жанчына.

Яна сказала, што ў час пажару яе падтрымаў сын, які прыехаў з Мінска на выхадныя. Але пажылая жанчына наадрэз адмовілася ехаць з дзецьмі ў горад. *"Хата ж у мяне ёсць, а ў горад я не хачу: тут, дома, лепей",* – разважыла пенсіянерка.

■ СВЯТЛАНА МАЛЫШКА



На гэтым помніку на партрэце маладога хлопца, які загінуў у мінулым годзе разам з маці, з'явілася чырвоная пляма, і рас-тлумачыць яе паходжанне ніхто не ў стане. ФОТО: ПЕТР ГУЗАЕВСКИЙ.

Сакрушальная бура на могілках у Будчы пакінула містычны след

ЗДАРЭННІ

Амаль на суткі засталіся без электрычнасці жыхары некалькіх вуліц у вёсках Будча, Пярэвалакі, В. Круговічы і М. Круговічы. З дахаў жылых і гаспадарчых пабудоў пазрывала шыфер. Мільённыя страты панеслі жыхары, чые родзічы пахаваны на могілках за Будчай, а містычны след на адным з помнікаў здзівіў нават старажылаў вёскі. Такія наступствы пакінула бура, якая пранеслася над Ганцавіцкім раёнам вечарам у мінулую суботу 1-га чэрвеня.

"Страшна, што тут рабілася! Раптоўна неба стала цёмным, віхор падняўся такі, што не было відно свету. У вёсцы дрэвы паваліла, а градам пабіла ўсходы пасеваў", – расказвае пенсіянерка Еўдакія Васільеўна Стральчэня. – *Помнікі на могілках паваліла, быццам касой з іх пазразала крыжы. А людзей колькі было ў нядзелю! Нават на свята столькі, можа, не бывала! Бо кожны ж хваляваўся, ці не пабіла помнікі. Хто мог, падрамантаваў і паправіў абернутыя помнікі і агароджы; а ў каго разбіла ўшчэнт, тым прыйдзецца шмат грошай траціць, каб новыя паставіць".*

Пад час буры на могілках за вёскай Будча было пашкоджана больш за трыццаць помнікаў і некалькі агароджаў. Ураганны вецер быў такой магутнай сілы, што дзясяткі металічных і бетонных крыжоў на стальных стрыжнях, якія былі замацаваны на помніках, былі нібы зрэзаны вострым лязом. Драўляныя крыжы паламала на дробныя кавалкі, а масіўныя помнікі па сто і больш кілаграмаў вагою магутная сіла стыхіі раскалола на часткі.

Акрамя відочных матэрыяльных разбурэнняў стыхія пакінула і містычны след. На адным з помнікаў з чорнага мармуру на партрэце маладога хлопца, які загінуў разам з маці на пажары ў мінулым годзе, на твары выступіла чырвоная, быццам кроў, пляма. Сястра і цётка нябожчыкаў, пенсіянерка Любоў Дайлід расказала, што адцірала гэтую чырвоную пляміну на помніку і вадой з пяском, і бензінам, і шампунем… Але след так і застаўся.

Разглядваючы разам з будчакамі наступствы стыхіі на могілках, аўтар гэтага артыкула таксама не мог знайсці ніякага, нават тэарэтычнага, тлумачэння неверагодных з'яў. Цяжка было нават уявіць, як магло ветрам пагнуць металічныя трубы з нержавейкі на агароджах (быццам па іх зверху білі кувалдай) і не зачапіць пры гэтым лёгкія вянкі і кветкі? Чаму быццам бы вострым лязом зрэзала крыжыкі, а помнікі не паварушыла? Ці вось яшчэ адзін дзіўны факт: адзін з помнікаў, які быў замацаваны на двух доўгіх штырах, віхрам падняло і апусціла на зямлю побач, нават не пагнуўшы стальных штыроў. Пашчасціла, што помнік застаўся цэлы.



На могілках у Будчы такіх разбураных помнікаў некалькі дзясяткаў. ФОТО АВТОРА



Ураганны вецер гнуў і зрэзваў жалезныя крыжы. ФОТО АВТОРА.

Прынесла непрыемнасці бура і жыхарам іншых вёсак. На вуліцах паваліла дрэвы і амаль на цэлыя суткі некалькі вуліц ў Будчы, Пярэвалаках і Вялікіх і Малых Круговічах засталіся без электрычнасці. Па словах старшыні Чудзінскага сельсавета Анатолія Кіціка, у Чудзіне і Будчы былі пашкоджаны жылыя і гаспадарчыя пабудовы, але матэрыяльныя страты былі невялікімі. У Чудзіне з сямі дахаў пабудоў пазрывала па 5-7 лістоў шыферу і на адным з дамоў вырвала тэлевізійную антэну. Па некалькі лістоў шыферу сарвала з двух будынкаў у Будчы. Усе паваленыя дрэвы прыбралі на працягу двух сутак, а разбітыя слупы электраперадач замянілі на новыя.

"Пасля буры работнікі электрасетак працавалі да трох гадзін ночы, і пасля ночы з суботы на нядзелю ўзнавілі падачу электрычнасці ва ўсіх вёсках", – сказаў начальнік раённых электрасетак Ігар Букса.

Па словах Ігара Сцяпанавіча, электрычнасць падалі ў першую чаргу на фермы, дзе патрэбна было тэрмінова даць кароў, а потым ліквідавалі і астатнія парывы ліній электраперадач.

"Ад імя пацярпелых жыхароў раёна хачу падзякаваць энергетыкам, супрацоўнікам выратавальнай службы і камунальнікам, якія пастараліся, прыбралі паваленыя дрэвы, а энергетыкі досыць хутка далі людзям святло ў дамы", – сказаў Анатоль Ільіч.

■ ПЯТРО ГУЗАЎСКІ

ГАНЦЕВЧАНЕ ОТВЕЧАЮТ

Есть ли перспективы развития малого бизнеса в Ганцевичском районе и почему? Какой бизнес нужно развивать?



Дарья Рожицкая, жительница города:
– Думаю, что перспективы есть. У нас в основном развивается частная торговля: открываются новые магазины в городе и роллеты на рынке. Хотелось бы, чтобы частники обратили внимание на сферу услуг и развлечений: например, создали бы клуб, боулинг...



Юлия Мещерякова, жительница города:
– Развиваться можно. Ведь государство помогает предпринимателям встать на ноги: выделяет место, дает субсидии, налоги снижает. У нас в районе много красивых мест и выгодно заняться экотуризмом. А в городе не мешало бы открыть что-нибудь для молодежи.



Эдуард Джафаров, житель города:
– Перспективы есть, но не во всех отраслях. Частной торговли у нас достаточно, а вот для отдыха и досуга людей нет ничего. Выгодно заниматься тем, где пока нет конкуренции. Например, открыть компьютерный клуб, а еще – построить бассейн. Это по силам предпринимателю.



Павел Пищ, учащийся Ляховичского аграрного колледжа:
– Без частного бизнеса в наше время не прожить. Предприниматели могли бы развивать город и обеспечить людей работой. Я думаю, что частникам было бы выгодно построить центр досуга для людей, куда могли бы пойти и дети, и молодежь, и люди зрелого возраста.



Нина Кухарчук, работник профлицея:
– В нашем районе очень мало частных предприятий. Вот если бы частники создали у нас минизаводики и дали людям работу. Реализовать себя можно, открыв цех по переработке молока или другой сельскохозяйственной продукции либо создать цех по пошиву модной одежды, обуви.



Евгений Мещеряков, пенсионер, житель д.Ганцевичи:
– Я не вижу перспектив, т. к. государство не видит смысла в развитии частного бизнеса в сельском хозяйстве. Я, например, выращиваю поросят. Разве мне выгодно за бесценок продавать мясо государству? Считаю, что развитие частного бизнеса зависит от руководства района.



Полина Комарчук, жительница города:
– У нас нет условий для развития бизнеса – город маленький, и нет выгоды что-то создавать и открывать. Я даже представить себе не могу, какой деятельностью можно заняться, чтобы работать не в убыток. Хотя можно попробовать что-то новое, чего у нас нет, в чём нет конкуренции, например, заняться экотуризмом.

■ ОПРОС ПРОВЕЛА СВЕТЛАНА МАЛЫШКО

КАЛОНКА РЭДАКТАРА



РЭДАКТАР ГАЗЕТЫ «ГАНЦАВІЦКІ ЧАС»
ПЕТР ГУЗАЕЎСКІ

Развіццё бізнесу ў Ганцавічах патрабуе падтрымкі

На сайце ganc-chas.by мы правялі апытанне «Ці з'яўляецца Ганцавіцкі раён перспектыўным для вядзення малога бізнесу?» Яго вынікі выклікаюць аптымізм. Бізнесам у раёне можна займацца, і для гэтага зараз ёсць усе падставы – так лічаць амаль палова рэспандэнтаў, а дакладней, 42% са 110 чалавек, якія прынялі ўдзел у апытанні. Сваю пазіцыю яны абумоўліваюць тым, што зараз дзейнічае спрошчаная працэдура рэгістрацыі ІП і юрыдычных асоб, а мясцовая ўлада стварае спрыяльныя ўмовы для развіцця бізнесу. У нашым раёне можна займацца агратурызмам, фермерствам ці пераапрацоўкай сельгаспрадукцыі.
З такой пазіцыяй згодны не ўсе. 55% апытаных мяркуюць, што перспектывы развіцця бізнесу ў Ганцавічах несуцяшальныя, бо даходы ў насельніцтва значна меншыя, чым у другіх рэгіёнах (так лічаць 23%), высокая канкурэнцыя (6%), дый і займацца бізнесам людзі, якія маглі б, не хочуць (29%). Выгадней стабільна атрымліваць зарплату з бюджэтнай казны, не задумваючыся, як здабыць грошы на зарплату сабе і работнікам , заплаціць падаткі і г.д.
Але ёсць яшчэ важная праблема – гэта адсутнасць інфармацыйна-адукацыйнай дапамогі, без якой разлічваць на развіццё бізнес-сектару не варта. Паўныя захады былі зроблены ў студзені мінулага года. У Ганцавічах быў створаны раённы савет па развіцці прадпрымальніцтва. У яго ўвайшлі прыватныя бізнесмены і работнікі райвыканкама. Але стваралася такое ўражанне, што савет створаны для "галачкі". Чаму? Роля бізнесменаў у гэтым савеце сумніўная, бо дапамагаць жадаючым, якія хочуць пачаць свой бізнес, наўрад ці ўваходзіць у іх інтарэсы. Ствараць сабе дадатковую канкурэнцыю ім нявыгадна. А работнікі райвыканкама і раней аказвалі кансультатыўную падтрымку па рэгістрацыі ІП і юр. асоб. Для паўнацэннага развіцця бізнесу гэтага мала. Узнікае пытанне: што наваяўлены бізнесмен будзе рабіць пасля дзяржаўнай рэгістрацыі? Дзе прайсці навучанне, як скласці бізнес-план, як атрымаць субсідыю ці крэдыт? Ёсць вопыт іншых гарадоў, дзе створаны так званыя бізнес-інкубатары, праводзяцца бясплатныя семінары. Ганцавічы браць іх вопыт на ўзбраенне пакуль не спяшаюцца.

Жывёлаводы СВК "Крышылавічы" скардзяцца на нізкую зарплату

СЕЛЬСКАЯ ГАСПАДАРКА

Незадаволенасць зарплатай і ўмовамі працы ў СВК "Крышылавічы" выказалі на мінулым тыдні жывёлаводы сельгаскааператыва з в. В. Круговічы, якія звярнуліся на "гарачую лінію" газеты "Ганцавіцкі час". У вёску выехаў наш журналіст і на месцы высвятляў прычыны, якія турбуюць работнікаў СВК.

"Зарплаты новы старшыня абяцаў павысіць, але нешта не відно таго павышэння. Мы ўжо хацелі не выходзіць на працу ў знак пратэсту, але шкада жывёлы, бо яна ж не вінаватая, яе карміць і даіць трэба, – скардзілася даярка са шматгадовым стажам Марыя Сташанін. – *Старшыня загадаў нікуды не скардзіцца, бо ўсё роўна мы нічога не даб'ёмся. Я 13 старшынь перажыла, і працую, і не баюся звальнення".*

Па словах Марыі Радзівонаўны, за мінулы месяц яе зарплата склала чыстымі 2 млн 400 тысяч рублёў. І гэта пры тым, што надаіла малака больш за ўсіх: 10 тон – вышэйшага і 5 600 кг – 1-га гатунку. Па яе словах, за вышэйшы гатунак даярцы налічваюць 140 тыс. рублёў за тону, а за 1-ы – 90 тысяч.

"Надоі не толькі ад нас залежаць, пасьбішчы трэба нармальныя. Вось як мукі дадуць больш – надоі адразу растуць, але ж не даюць столькі, колькі патрэбна па рацыёне", – расказвае даярка.



Даглядчык Уладзімір Заяц даглядае больш за сто цялушак і атрымлівае зарплату каля паўтара мільёна рублёў. ФОТА АЎТАРА.

Скардзіліся жывёлаводы і на тое, што няма на комплексе расцэнак аплаты працы і ў разліковых лістках не ўказана, за што налічана зарплата.

Некаторыя работнікі лічаць, што новы старшыня СВК "Крышылавічы", які прыступіў да працы каля трох месяцаў таму, узяўся за справу "закрута".

"Мы не супраць таго, што навесці парадак трэба, і тут я яго падтрымліваю. А то колькі ні працуй, а зарплата як была жабрацкая, так і застаецца, – сказаў даглядчык Уладзімір Заяц. – *Я ж не патрабую нейкай заоблачнай зарплаты, але за мінімалку без выхадных дзён ці варта працаваць? Чым карміць дзяцей? За мільён трыста тысяч?".*

"Начальства кажа, што прывага малая. А адкуль жа ёй узяцца, калі цялушкі ў жыжы стаяць? Гной высунулі, а падасланы няма чым. Кармы абы -якія", – скардзіўся даглядчык.

Скардзіліся жывёлаводы і на тое, што рэдкім госцем на круговіцкіх ферма з'яўляецца галоўны заатэхнік Антаніна Аляксейчык, бо акрамя ветэрынара Аляксандра Шэстака і старшыні СВК, ніхто не паказваецца з Вострава, дзе знаходзіцца цэнтральная сядзіба праўлення сельгаскааператыва.

Як патлумачыў намеснік начальніка ўпраўлення райсельгасхарчу Ганцавіцкага райвыканкама Іван Янюк, расцэнкі на аплату за надоі малака і догляд жывёлы кожная гаспадарка ўстанаўлівае самастойна. Напрыклад, у Мінскай вобласці ў перадавых гаспадарках расцэнкі значна ніжэйшыя, чым у нашых сельгаскааператывах, але зарплата вышэйшая, бо надойваюць яны значна больш. За гатункі «Экстра» і «Вышэйшы» расцэнкі вагаюцца ад 70 да 150 тысяч рублёў за тону надоенага малака. А за 1-шы гатунак – увогуле 50-60 тысяч рублёў за тону.

"Нават калі параўноўваць надоі на фермах участка ў Дзяніскавічах на ААТ "Ганцавіцкага райаграсэрвіса", то амаль пры аднолькавых расцэнках зарплаты ў даярак там большыя, бо зараз у сярэднім надой ад каровы ў іх 17,35 літраў у дзень, а ў СВК "Крышылавічы" – 11,33 літра", – патлумачыў Іван Канстанцінавіч.

Старшыня СВК "Крышылавічы" Сяргей Хадатчук згадзіўся, што некаторыя праблемы ёсць, але вырашыць іх – гэта справа не аднаго дня і нават месяца. *"Я сустракаюся кожны дзень з людзьмі і тлумачу, што нельга за месяц ці два дабіцца адразу бачнага выніку. Пасля таго як я заступіў на пасаду старшыні, першым, каму я загадаў павысіць расцэнкі, былі жывёлаводы. Мы зараз працуем над паляпшэннем кармавой базы. Хачу, каб людзі мяне разумелі і дапамагалі",* – сказаў Сяргей Іванавіч. – Ад малака ў нас ільвіная доля даходаў, і калі будзем усе старацца, то будуць і большыя зарплаты, і лепшыя ўмовы працы".

■ ПЯТРО ГУЗАЕЎСКІ

Председатель райпо обещает обустроить торговые места на рынке

АКТУАЛЬНО

Частой жалобой на телефон горячей линии «ГЧ» стало сообщение о том, что на Ганцевичском рынке, особенно в сезон дождей, в парке, где торгуют приезжие предприниматели, из-за луж и грязи невозможно пройти. Недовольны таким торговым местом не только продавцы, но и покупатели.





На ганцевичском рынке после дождей и продавцы и покупатели испытывают неудобства. ФОТО ПЕТРА ГУЗАЕВСКОГО

«Чтобы купить летом «босоножки» на рынке, нужно идти туда в резиновых сапогах, – грустно пошутила горожанка Валентина Заяц. – *Стыдно даже становиться, когда начинаешь примерять обувь и обнаруживаешь, что ноги из-за потопа на торговых местах грязные».*

По словам женщины, такой шопинг не только не приносит удовольствия, за покупками в сезон дождей вообще ходить не хочется. Взрослый может как-то обойти, а что делать детям? Поставить обувь во время примерки в грязь – это тоже не дело. Людям нужно не просто пройти, а присмотреться, примерить. А вокруг лужи. Валентина Михайловна сказала, что к некоторым палаткам, несмотря на то, что продавцы стараются прокладывать импровизированные «мостики», нельзя подойти. Искомый товар можно проглядеть из-за того, что постоянно нужно смотреть под ноги, дабы не угодить в лужу. По ее мнению, неудобства испытывают и покупатели, и продавцы, поэтому рынок должен быть обустроен.

Понятны и претензии продавцов. Некоторым из них попадают такие торговые места, что им логично было бы только лодками да сапогами торговать. Например, предприниматель Наталья Борейко, торгующая одеждой, жалуется, что напротив ее торгового места даже при небольших дождях стоят лужи, и, соответственно, покупатели обходят палатку стороной.

«Нам подняли цену за место на рынке от 5 до 35 тысяч, а условия для торговли сделать лучшими пока только обещают», – пожаловалась Наталья Вячеславовна.

С вопросом о том, когда будет обустроен рынок в городе Ганцевичи, корреспондент обратилась к председателю Ганцевичского РАЙПО Александру Селюжицкому.

Он сообщил, что уже есть договоренность о благоустройстве рынка. Запланирована подсыпка самых низких мест, а также в дальнейшем будут заливать дорожки между торговыми рядами.

«Вышло так, что приступить к работе не дают обильные ливни, которые особенно разгуливаются по субботам. Как только станет возможным, работа по благоустройству рынка начнется», – пообещал Александр Владимирович.

■ ЮЛИЯ ПОЛЕССКАЯ



Зинаида Минич в очередной раз пришла в квартиру Ивана Иванисени выяснить причину затопления ее квартиры.
ФОТО ПЕТРА ГУЗАЕВСКОГО.

Что делать, если вас затопили соседи?

ЕСТЬ ПРОБЛЕМА

Звонки на горячую линию «ГЧ» со словами «Приезжайте скорее, меня затопили!» поступают очень часто. У многих такая беда бывает случайной, а для жителей 28 дома по ул. Октябрьской г. Ганцевичи затопление по вине одного из жильцов уже стало закономерностью.

В редакцию «ГЧ» обратилась Зинаида Минич, проживающая по улице Октябрьской, 28, которая рассказала о беде, преследующей ее уже более двух лет. Проблема в том, что ее квартиру уже неоднократно затапливал сосед Иван Иванисеня, проживающий этажом выше. Женщина уже устала бороться с нерадивым хозяином квартиры. Она показала огромное количество рапортов из милиции, актов, составленных коммунальниками, и других справок, подтверждающих неоднократные факты затопления. Но беда в том, что все эти протоколы не оказывают никакого влияния на соседа. В последний раз, 27 мая, Иван Александрович затопил все квартиры, расположенные под ним. Вода с четвертого этажа проникла до первого. В квартире Зинаиды Васильевны даже проводка на кухне горела. Ее квартира застрахована, и компенсацию за нанесенный ущерб женщина должна получить от страховой компании. Но неужели никак нельзя заставить соседа соблюдать правила пользования жилым помещением?

Из имеющегося у горожанки рапорта, составленного лейтенантом милиции Ганцевичского РОВД, стало понятно, что гражданин Иван Иванисеня, тот самый сосед «сверху», ведет аморальный образ жизни, собирает у себя в квартире сомнительных людей и злоупотребляет спиртными напитками. А в итоге из-за неисправности сантехнического оборудования он периодически затапливает всех соседей снизу.

В поисках решения проблемы автор статьи обратилась к директору КУМПП ЖКХ «Ганцевичское РЖКХ» Алексею Голяку.

Какие меры могут и должны предпринять коммунальные службы, если поступила жалоба о затоплении?

– Наши специалисты совместно с комиссией из горсовета и санстанции выезжают на место и составляют акт. Для составления акта необходимо обратиться в ЖКХ по телефону 2 -71- 61.

Что нужно делать пострадавшей стороне в первую очередь?

– В первую очередь нужно отключить электричество и попробовать устранить течь (если это, конечно, возможно). Если это будний день, достаточно сделать звонок в ЖКХ по тел 115. В субботу дежурный сантехник тоже выезжает на вызовы. В случае, если это воскресенье, тут поможет круглосуточная аварийная служба. Даже если в той квартире, откуда течет вода, никого нет, они смогут отключить воду по всему стояку.

Течь устранили. Что нужно сделать пострадавшей стороне, чтобы соседи возместили ущерб?

– Во-первых, независимо от силы затопления и понесенного ущерба причиненные повреждения, прежде всего, необходимо зафиксировать документально – составить акт. Причиненный ущерб нужно зафиксировать на фотоаппарат или на камеру мобильного телефона. Эти записи помогут, если «организаторы мокрого дела» потом примутся отрицать свою вину или рассказывать о минимальном вреде. Оформляется акт обследования по факту затопления, который подписывается уполномоченными лицами. Судьи опираются, главным образом, на официальный документ – акт о затоплении. Во-вторых, как показывает практика, не менее важно доказать, что испорченный телевизор и отслоившаяся фанера дорогого комода – это также следствие забывчивости соседа. К заявлению обязательно стоит приложить фотографии, которые наглядно продемонстрируют повреждения. Важно отметить, что участие в этом процессе виновника обязательно! В крайнем случае его необходимо официально уведомить об обследовании вашего помещения на предмет установления ущерба. Если помещение было застраховано от этого вида повреждения, ущерб возмещается страховой компанией.

Какое значение имеет акт?

– Именно он имеет законную силу, когда дело доходит до суда. А такое иногда бывает, ведь не всегда соседи готовы платить за ущерб. На основе этого документа будет определен виновный, а на основе сметной стоимости повреждений будет возмещен ущерб пострадавшему.

Также в акте указываются возможные скрытые повреждения, потому что вода, просочившаяся сквозь щели, может проявиться в том или ином месте несколько дней спустя. Данный акт остается у вас, пока не решится вопрос по возмещению ущерба, причиненного вашему жилью.

Акт составлен, что делать дальше? Как определяется сумма ущерба?

– После составления акта вам нужно будет произвести оценку ущерба, нанесенного вашей квартире. Такую оценку за определенную сумму денег осуществляет специально созданная для этого комиссия. Таким образом, у вас появится еще один документ – отчет о размере ущерба. Имея на руках эти документы, вы можете предпринять еще одну попытку договориться с соседями. Обычно таких письменных доказательств достаточно для того, чтобы соседи согласились «добровольно» возместить вам причиненный ущерб. Если же соседи отказались от мирного разрешения дела, то с ремонтом вам придется подождать, а документы отнести в суд.

■ ЮЛИЯ ПОЛЕССКАЯ

За антисанитарию – на выселение!

СОЦИУМ

За несоблюдение правил пользования жилым помещением жильца квартиры могут нее только привлечь к административной ответственности, но и выселить из его собственной квартиры.

Проблема нехороших соседей есть почти в каждой много-этажке. Таким соседом может оказаться блаженный старик, тянущий из мусорных контейнеров всякие «нужные» вещи; любитель ночных «тусовок», который постоянно веселит соседей громкой музыкой; тот, кто устраивает ремонт в неположенное время; сердобольная бабушка, приютившая несколько кошек. Кроме всего этого, есть квартиры, превращенные в притоны алкоголиков или наркоманов, и это является серьезной угрозой безопасности для людей, проживающих в соседних квартирах. Такое соседство обычно чревато антисанитарией: болезни и тараканы из «грязных» квартир рано или поздно появятся и в квартирах соседей.

По словам директора КУМПП ЖКХ «Ганцевичское ЖКХ» Алексея Голяка, все эти факты несоблюдения правил пользования жилым помещением являются поводом для обращений в ЖКХ, к участковому милиционеру или в горсовет. Если будет составлено три и более административных протокола за нарушение правил пользования жилыми помещениями, то владельцу квартиры грозит выселение.

По словам Алексея Федоровича, такое в городе Ганцевичи было. Последний случай произошел более года назад, когда жильца из квартиры по улице Заслонова переселили в дом без удобств по улице Грицевца.

По закону систематических нарушителей порядка в доме могут выселять в квартиры с меньшей жилой площадью и с худшими условиями для проживания. Более того, новое жилье могут предоставить за пределами города или другого населенного пункта, в котором проживает нарушитель. Причем силовые меры распространяются не только на жильцов государственных квартир, но и на тех, у кого жилье приватизировано.

«Практика показывает, что до крайних мер доходит редко. Обычно человек исправляется после административного наказания, штрафов», – поделился Алексей Федорович.

По его словам, теперь люди внимательнее относятся к своему жилью, понимают, что ответственность за несоблюдение правил пользования жилым помещением перед другими жильцами большая.

«Есть, конечно, единицы, которым закон не писан, но мы совместно с санстанцией и горсоветом стараемся бороться с ними», – подытожил Алексей Голяк.

■ ЮЛИЯ ПОЛЕССКАЯ

Строительство новой КНС решит проблемы с канализацией.

ГОРЯЧАЯ ЛИНИЯ «ГЧ»

Пройдя по городу, несложно было найти подтверждение жалобы жителей на телефон горячей линии «ГЧ» по поводу протекающей канализации. На все обращения и жалобы жителей города Ганцевичи директор КУМПП ЖКХ «Ганцевичского ЖКХ» Алексей Голяк дал конкретный ответ.

«Не успеваем подлатать канализационные трубы в одном месте, как их рвёт в другом», – сказал Алексей Федорович.

На первый взгляд может показаться, что растекшаяся вода – это лужи после обильных дождей, но подойдя поближе и ощутив все ароматы, исходящие от растекающихся по окрестностям канализационных отходов, понимаешь, что в «мокром деле» виноват не дождь, а скорее всего старые канализационные трубы.

По словам директора коммунхоза, совсем недавно была устранена поломка в деревне Денисковичи: в центре деревни по улице Ленина, возле учительского дома, была порвана канализация. Но, по словам Алексея Голяка, поломка уже устранена. Была произведена замена старых труб и прочищена канализационная сеть. Решена также тянувшаяся уже долгое время проблема с канализацией по улице Заводской. А по поводу неисправности канализационной системы по улице Строителей (между общежитием КПД и домом №3а) Алексей Федорович сказал, что в данный момент техника работает, ведутся работы по прокладке двух новых напорных коллекторов. Затем будет строиться новая КНС (канализационная насосная станция). После подключения к ней проблемы с канализацией по улице Строителей и Заводской будут решены. Завершить работу планируется к осени.

■ ЮЛИЯ ПОЛЕССКАЯ

Расклад імшы ў касцёле Адведзінаў Найсвяцейшай Панны Марыі

(з 6 па 13 чэрвеня)

6 чэрвеня, чацвер.
19.00 Святая Імша.
Успамін Святога Норберта, біскупа.
7 чэрвеня, пятніца.
9.00 і 19.00 Святая Імша.
Урачыстасць Найсвяцейшага сэрца Пана Езуса.
8 чэрвеня, субота.
12.00 Святая Імша.
9 чэрвеня, нядзеля.
9.00 Святая Імша (пол.)
11.30 Святая Імша (бел.)
Успамін Святога Эфрэма, дыякана і доктара касцёла
10 чэрвеня, панядзелак.
19.00 Святая Імша.
11 чэрвеня, аўторак.
19.00 Святая Імша.
Свята Святога апостала Барнабы.
12 чэрвеня, серада.
19:00 Святая Імша.
13 чэрвеня, чацвер.
19.00 Святая Імша.
Успамін Святога Антонія Падуанскага, святара і доктара касцёла.

Расписание богослужений в Свято-Тихоновском храме

(з 6 по 13 июня)

8 июня, суббота.
17.00 Вечернее богослужение.
9 июня, воскресенье.
Неделя о слепом.
9.00 Божественная литургия.
12 июня, среда.
17.00 Вечернее богослужение.
13 июня, четверг.
Вознесение Господне.
9.00 Божественная литургия.
Храм открыт ежедневно с 9.00 утра до 12. 00.
■ ПОДГОТОВИЛА ЮЛИЯ ПОЛЕССКАЯ

ЯНЫ ПАЙШЛІ З ЖЫЦЦЯ...

15 МАЯ
Крупеніч Васілій Ільіч, 79 гадоў, в. Хатынічы.
21 МАЯ
Шушко Алена Цімафееўна, 86 гадоў, в. Любашава.
23 МАЯ
Кляўчэня Анастасія Гаўрылаўна, 85 гадоў, в. Дзяніскавічы.
Грыбоўскі Уладзімір Канстанцінавіч, 54 гады, г. Ганцавічы.
Кісялевіч Галіна Міхайлаўна, 38 гадоў, г. Ганцавічы.
24 МАЯ
Гардзей Марына Аляксееўна, 23 гады, в. Нач.
Шуляк Канстанцін Канстанцінавіч, 63 гады, г. Ганцавічы.
25 МАЯ
Груша Алена Захараўна, 76 гадоў, г. Ганцавічы.
Уласень Анатолій Іванавіч, 65 гадоў, г.Ганцавічы.
Мацукевіч Ірына Станіславаўна, 87 гадоў, в. Кукава.
25 МАЯ
Муха Зінаіда Максімаўна, 72 гады, г. Ганцавічы.
28 МАЯ
Жыткевіч Раіса Міхайлаўна, 59 гадоў, в. В. Круговічы.
Піваварчык Марыя Адамаўна, 84 гады, г. Ганцавічы.
29 МАЯ
Лайша Вікторыя Міхайлаўна, 58 гадоў, г. Ганцавічы.

Архіепіскап Стэфан асвяціў новую царкву у Дзяніскавічах

Урачыстае адкрыццё Свята-Міхайлаўскай царквы ў в. Дзяніскавічы, богаслужэнне на якім правёў Архіепіскап Пінскі і Лунінецкі Стэфан, адбылося у мінулую суботу 1-га чэрвеня. На мерапрыемства сабралася каля двухсот жыхароў Дзяніскавіч, кіраўніцтва райвыканкама, а таксама праваслаўныя святары з усяго раёна.

Архіепіскапа Стэфана каля ўваходу ў царкву сустракалі з караваем і кветкамі. ФОТА: ПЕТР ГУЗАЕВСКІЙ.

Прадстаўніка высокага духавенства, які прыехаў на чорным кітайскім мінівене, прыхаджане пачціва віталі караваем хлеба і прыгожым букетам кветак. Ад дарогі да ўваходу ў царкву была выслана дарожка з жывых кветак. Па традыцыі Стэфан благаславіў усіх прысутных і павіншаваў з Пасхай.

У царкве, дзе амаль дзве гадзіны праходзіла богаслужэнне, места хапіла толькі невялікай частцы людзей. Пасля службы святары з харугвамі, казакі і прыхаджане ўрачыстай працэсіяй здзейснілі ход вакол новай царквы.

